# ПАМЯЦІ А. М. ГОРКАГА

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна адзначае трэцюю гадавіну з дня смерці класіка рускай і сусветнай літаратуры А. М. Горкага адкрыццём выставак, фотавітрын, прысвечаных літаратурна-публіцыстычнай дзейнасці вялікага пролетарскага пісьменніка. У агульнай чытальні абсталявана фотавітрына, якая адлюстроўвае вялікі жыццёвы шлях Алексея Максімавіча, яго кроўную сувязь з працоўным народам. Тут прадстаўлены фотаілюстрацыі да твораў «Мать», «На дне», «Враги» і інш.

У бібліятэцы ёсць звыш 1700 тамоў твораў А. М. Горкага. Большасць з іх заўсёды на руках у чытачоў. Аддзел міжбібліятэчнага абанемента сістэматычна высылае творы Горкага калгаснікам, настаўнікам, партыйным работнікам раёнаў рэспублікі. Нядаўна вясковаму настаўніку з Даманавіцкага раёна тав. Булаўко былі высланы літаратурна-крытычныя артыкулы Горкага. 60-гадовы калгаснік тав. Грамадскі з сельгасарцелі «Калгаснік Беларусі», Пухавіцкага раёна, прачытаў высланыя яму творы «Мать», «Дело Артамоновых» і рад апавяданняў Горкага. (БЕЛТА).